

П. А. **Бяссонаў**.

дзе муж з жонкай п'е» выкарыстаў Ф.Шапэн.

*А. С. Фядосік.*

**БЯССО́НАЎ** Пётр Аляксеевіч (16.6.1828, Масква — 6.3.1898), рускі фалькларыст-славіст, публіцыст, гісторык літаратуры. Скончыў Маскоўскі універсітэт (1851?). У 1864—67 працаваў старшынёй Віленскай археаграфічнай камісіі, дырэктарам Віленскай публічнай бібліятэкі і інш., уваходзіў у склад камісіі па рэарганізацыі Віленскага музея старажытнасцей. Бліжэй пазнаёміўся з бел. гісторыяй, культурай, фальклорам. Падрыхтаваў і выдаў «Песні, сабраныя П.В.Кірэеўскім» (вып. 1—10, 1860—74), «Калікі вандроўныя» (вып. 1—6, 1861—64, увайшлі рускія і бел. духоўныя вершы). Падзяляў погляды *міфалагічнай школы*. Аснову зборніка «Беларускія песні» (вып. 1, 1871) склалі матэрыялы карэспандэнтаў бел. і польскага паходжання, дасланыя П.Кірэеўскаму і Б. У прадмове выклаў свае навуковыя і грамадска-палітычныя погляды, якія не зусім адпавядалі афіцыйнаму пункту гледжання на бел. культуру. Высока цаніў уклад беларусаў у культуру ўсходніх славян, але ў будучыню бел. культуры і літаратуры не верыў. Жанравае багацце бел. фальклору і традыцыйную абраднасць успрымаў з пункту гледжання праваслаўя і народнасці ў яе патрыярхальным значэнні. Падкрэсліваў архаічнасць і самабытнасць традыцыйнай культуры беларусаў. Большасць тэкстаў зборніка складаюць узоры каляндарна-абрадавай паэзіі: песні калядныя, масленічныя, валачобныя, юраўскія, купальскія, пятроўскія, кустовыя, мікольскія, размеркаваныя ў адпаведнасці з перыядамі земляробчага календара года. Ёсць і ўрывак з батлейкі. У фалькл. працах супастаўляў абрады і звычаі, песні розных славянскіх народаў.

*Літ.*: Цвікевіч А. Погляд П.Бяссонава на беларускую справу // Беларускі сцяг. 1922. №2—3, 4; Цішчанка І.К. Пётр Аляксеевіч Бяссонаў // Беларуская фалькларыстыка: Збіранне і даслед. нар. творчасці ў 60-х гг. XIX ст. — пач. XX ст. Мн., 1989; Ліс А. Самотны сярод абрусіцеляў, або Некалькі слоў пра Пятра Бяссонава // Спадчына. 1997. №6; Гулак А. Тышкевіцкі музей старажытнасцяў: малюнкі спусташэння // Там жа. 1995. №2; Яе ж. Народнік, далёкі ад народа // Полымя. 2000. №4; Яе ж. Невядомы нарыс П.Бяссонава пра Беларусь // Весн. БДУ. Сер. 4. 2003. №3.

*А. А. Гулак.*